З верай у казку

# ШТО ТРЭБА, КАБ ВЫКАНАЦЬ УСЕ ПАЖАДАННІ БЕЛАРУСАЎ?

## Пра гэта ведаюць Дзед Мароз і яго жонка Матухна Зіма



Галоўны чараўнік краіны з Матухнай Зімой.

**У сучасным свеце людзі ўсё менш стасункуюцца праз лісты, але да яго пошта прыходзіць штодня. «Звязда» з'ездзіла ў госці ў Белавежскую пушчу да галоўнага Дзеда Мароза краіны, дапамагла разабраць карэспандэнцыю і даведалася, пра што чараўніку пішуць дзеці і дарослыя.**

### КУФАР У СХОВІШЧЫ

Па прыездзе нас сустрэў сам Дзед Мароз з жонкай і запрасіў у яе майстэрню.

— Знаёмцеся, гэта — Матухна Зіма, а яшчэ ў нас ёсць тры дачкі: Сцюжа, Завіруха і Мяцеліца. Малодшая выйшла замуж за Снегавіка, і нарадзілася мая ўнучка — Снягурачка. Ведаеце, я адзіны Дзед Мароз, у якога ёсць сям'я, у калег з Расіі ці Украіны яе няма, а іх унучкі нарадзіліся са снегу і чараўніцтва.

Па дарозе да майстэрні мы даведаліся, што ўсе лісты і малюнкі пасля прагляду і адказу Дзеда Мароза трапляюць у бяздонны куфар у сховішчы. Ён з'явіўся там шаснаццаць гадоў таму, і ў ім больш за трыста тысяч пісьмаў.

— Яны да нас прыходзяць круглы год, падлічыць іх немагчыма — кажа Матухна Зіма, — пасля пятай тысячы збіваешся. Мы вызначаем колькасць па мяхах і скрынках. Вось толькі ўчора нам прынеслі пяць мяшкоў. Затое стараемся праводзіць падлік адпраўленых лістоў. Летась адказалі на сямнаццаць тысяч, і — паверце — гэта далёка не мяжа! Іх так шмат, што прагледзець усё ў сховішчы не атрымліваецца, таму ў маёй майстэрні зараз сапраўднае паштовае аддзяленне! Дарэчы, вось мы і прыйшлі.

### ПАШТОВАЯ УНІЯ ДЗЕДАЎ МАРОЗАЎ

Зайшоўшы ў майстэрню Матухны Зімы, перш за ўсё мы ўбачылі мноства скрынак з лістамі. Дзед Мароз адразу папярэдзіў, што блытаць іх ні ў якім разе нельга і ўсё трэба класці на месца, бо ў кожнай скрынкі сваё прызначэнне.

— Вось тая, што злева, — гэта звароты без адраса адпраўлення, на такія мы, на жаль, не зможам адказаць. А на палічцы стаяць яшчэ з 2017 года, на якія па розных прычынах не змаглі напісаць адразу, і яны чакаюць сваёй чаргі. Ёсць у нас і асобная папка з лістамі з розных краін.

Такіх лістоў у Дзядулі Мароза сотні. Тайвань, В'етнам, Ганконг, Японія, Расія, Украіна... У маёнтку пабывалі турысты з 95 краін свету! Яны прыязджаюць, робяць фатаграфіі, расказваюць у сябе на радзіме пра падарожжа і пішуць у Белавежскую пушчу пажаданні.

— На жаль, ім я адказаць не магу, не паліглот. Паток лістоў вельмі вялікі, таму Дзеды Марозы сёлета параіліся і вырашылі стварыць паштовую унію. Яна працуе вельмі проста: жаданне, якое трапіла да «чужога» Дзеда Мароза, аўтаматычна адпраўляецца ў патрэбную краіну. А для сувязі ў Дзедаў Марозаў ёсць спецыяльныя ёлачкі, якія служаць чароўнымі антэнамі.

### ШТО ПРОСЯЦЬ?

У дзяцей сёння ў пашане канструктары «Лега». На другім месцы — тэлефоны і планшэты, следам ідуць робаты, лялечныя домікі, лялькі і цацкі ў выглядзе персанажаў з мульцікаў. Але ёсць і тыя, якія добры чараўнік адкладае ў асобны стос...

### «ДЗЯДУЛЯ, ВЯРНІ ЎСЁ ЯК БЫЛО...»

— Часта дзеці просяць, каб бацькі пераcталі піць, — кажа Дзядуля Мароз, — але вось адна дзяўчынка, якая летась пісала мне гэта пажаданне, сёлета даслала такое пісьмо: *«Дзед Мароз, вялікі дзякуй, што вы выканалі маё запаветнае жаданне. Наш тата больш не п'е, ходзіць злы як чорт, дзверцамі халадзільніка ляскае. Калі ласка, вярніце ўсё як было».*


Карэспандэнт «Звязды» напісала на паштоўцы самае патаемнае...

### ДЗІЦЯЧАЯ ЗАЙЗДРАСЦЬ

— А вось я літаральна ўчора прачытала не менш дзіўны ліст, — кажа яго жонка, — у ім адна дзяўчынка зайздросціць сваёй сястры ў прыёмнай сям'і: «Я моцна зайздрошчу Віцы, таму што яна ездзіць кожны год у Італію». Вось потым сядзі і думай, як правільна дзіцяці растлумачыць, што зайздрасць — гэта дрэнна. Бо мы не ведаем, чаму сястра ездзіць за мяжу, можа, яна вучыцца там або ведае мову, ёсць жа мноства прычын на гэта.

### СЯБРА НЕ ПАДОРЫШ

Прагледзяючы лісты, мы заўважылі, што мноства дзяцей просіць хатніх жывёл. Удакладняем у нашых герояў, як яны выходзяць з гэтай сітуацыі.

— У мяне быў выпадак, калі хлопчык пяты год кацянё загадваў, але свой запаветны падарунак так і не атрымліваў. Ніяк не магла зразумець, у чым рэч, — успамінае Матухна Зіма. — Я дзіцяці адказвала, што ў мяне каля майстэрні цэлых пяць, выбірай любога! Уяўляеце: кацянё ад Дзеда Мароза і Матухны Зімы?! А ён адмаўляецца! Аказалася, што ў мамы алергія на поўсць. Я яму тлумачыла, што так нельга: табе будзе добра, а маме дрэнна. Гэта я так разважала, а мой муж мудрэйшы за мяне, недарэмна на пяць тысяч гадоў старэйшы... Ён тлумачыць, што жывёла — гэта сябар, а падарыць сябра немагчыма!



...разам з імі многія адпраўнікі дасылаюць свае малюнкі.

### КОЖНЫ ЧАЛАВЕК — ЧАРАЎНІК!

Дзед Мароз не выконвае жаданняў, ён дае магчымасць самому чалавеку абудзіць у сабе добрага чараўніка. І дарослыя людзі, якія гэта разумеюць, пішуць яму вось такія лісты: «Прашу дапамогі ў Дзеда Мароза, хай усё складзецца так, як я хачу. Дай, Дзядуля Мароз, трошачкі цуду, дай трошачкі поспеху, дай сілы мне выканаць усё, што я хачу...»

— І ў іх усё атрымліваецца, — удакладняе чараўнік, — да мяне шмат такіх пісьмаў прыходзіць, вось вам яшчэ адно: «Гэта ўжо трэці мой ліст, які я перапісваю. Мінулыя два выкарыстоўвала як нагоду выгаварыцца, і ў мяне атрымалася. Дзякуй».

### ЛІСТЫ АД БАБУЛЬ

— Вось у мяне ўчора было два лісты, я іх адкрыла запар, так атрымалася.

Яны ад бабуль, адной з якіх 90 гадоў! З іх 45 яна прапрацавала настаўніцай у школе і піша пра тое, што вышывае крыжыкам, уяўляеце?! І просіць у Дзеда Мароза набор для вышывання, ні на што не скардзячыся. А другой дзесьці 60—70 гадоў. Кім працавала гэтая, я не ведаю, але сам падыход зусім іншы. Суцэльныя скаргі, хоць яна нашмат маладзейшая. І ў падарунак просіць здароўя і апарат для вымярэння ціску.

— Такім людзям я тлумачу, што мне пісаць трэба, а да доктара ісці, калі са здароўем бяда, — умешваецца дзядуля, — але калі акрамя мяне гэты апарат падарыць ніхто не зможа, то я ёй яго прывязу!


Лісты ад дзяцей і дарослых прыходзяць штодня...

### ЗВАНОК З МАЁНТКА

У «паштовых» скрынках знаходзяцца і такія лісты, на якія дзядуля не проста піша адказ, а асабіста тэлефануе на названы нумар. Вядома, такое здараецца нячаста, але сёлета ўжо было некалькі выпадкаў.

Адкрываем першы такі ліст і чытаем: «Дзед Мароз, зрабі, калі ласка, так, каб мяне на Новы год адпусцілі да мамы дадому. Ніяк нельга без мамы сустрэць Новы год».

— Гэтае пасланне мне напісаў непаўналетні падлетак з дзіцячай калоніі. Пасля яго пісьма следам прыйшоў ліст ад мамы з такой жа просьбай. Ну і што мне было рабіць? Я патэлефанаваў у калонію для непаўналетніх, прадставіўся, растлумачыў ім сітуацыю. Спачатку яны доўга смяяліся вынаходлівасці хлопчыка, а потым расказалі, які ён «добры», якія ў яго «подзвігі» на рахунку разам з мамай на пару.

### «ПРАБАЧ, ШТО НЕ ВЕРЫЛА»

— Бывае такое, што людзі пішуць ліст і пачынаюць з фраз: «Не асабліва верыца, што ты існуеш», або: «Я не веру». Адразу хочацца спытаць: дык навошта вы звяртаецеся, — абураецца Матухна Зіма.

— Я адзін раз патэлефанаваў дзяўчыне, якая ў пісьме прасіла дапамогі, а ў канцы напісала, што не вельмі ў мяне верыць. Яна так была здзіўленая маім учынкам, адчувалася, што ёй сорамна. Мы з ёй пагаварылі, і я растлумачыў, што нічога не споўніцца, калі няма жадання і веры, — пярэчыць Дзед Мароз.

### ВЫКАНАННЕ МАР

— Часта госці, якія да нас прыязджаюць, пішуць свае пажаданні адразу на месцы або прывозяць іх з сабой. Для такіх выпадкаў сёлета ўстанавілі цудометр, — кажа Матухна Зіма і просіць Дзеда Мароза апавесці пра яго. — Гэта ж тваё вынаходніцтва, і так, як ты, пра яго не раскажа ніхто.

Дзядуля, які ўжо рыхтуецца прыняць першых у гэты дзень гасцей, спачатку бурчыць, што механізм цудометра сакрэтны, але потым здаецца і раскрывае таямніцы свайго вынаходства.

— Ён быў адкрыты сёмага снежня, да мяне прыехала яшчэ пяць маіх калег, і мы запусцілі яго ў дзеянне. Цудометр рэгіструе колькасць чароўнай энергіі,



якая змяшчаецца ў кожным дасланым лісце. Эмпірычным шляхам у лабараторных умовах было вызначана, што ў кожнай паштоўцы ўтрымліваецца ад 0,5 да 3 чароўных адзінак — кважэлаў, ад словазлучэння «квант желания». Энергія акумулюецца ў прыборы і ўначы Новага года расходуецца на выкананне ўсіх мар. Паводле здагадкі навукоўцаў, для таго каб выканаць усе жаданні беларусаў, прыбор да 31 снежня павінен назапасіць 99 999 кважэлаў.

— Тэорыя — гэта, вядома, добра, але лепш усё ўбачыць на свае вочы, — удакладняе Матухна Зіма і прапануе нам напісаць свой ліст і апусціць у цудометр. — Вось, трымайце паштоўку і пішыце самае патаемнае.

Як мы маглі адмовіцца ад такой прапановы?!

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**
**Фота аўтара.**
*Мінск — маёнтак Дзеда Мароза — Мінск.*